
Аурэл Скобіаалэ

Чаму вучыць прымаўка



Аурэл Скобіаалэ

Чаму вучыць прымаўка

МІНІЯЦЮРЫ



Мінск
«Юнацтва»
1993

ББК 84Мол7
С 44
УДК 859.2-93

Пераклад з малдаўскай
У. А. Паўлава

Мастак
А. А. Арынушкін

Для малодшага школьнага ўзросту

Книга миниатюр известного молдавского писателя состоит из четырех разделов. Сначала рассказывается о деревенском мальчике Стэнике и его товарище Дэнуце, о происшествиях и приключениях, которые происходят с ними. Затем — о двенадцати месяцах года.

В третьем разделе внезапно заспорили знаки препинания: кто из них самый-самый главный. И наконец, городской мальчик попадает в передвижной зоопарк.

4803420201—024
С ——————— 102—92
М 307(03)—93

ISBN 5-7880-0759-3

© А. А. Скобіаалэ, 1993
© Пераклад. У. А. Паўлаў, 1993
© Афармленне. А. А. Арынушкін, 1993


Атэнікэ –
бывалы чалавек



СТЭНІКЭ — БЫВАЛЫ ЧАЛАВЕК

Кажуць, у кожным сяле ёсць свой Стан — Бывалы Чалавек. Няхай ён малы ці трохі большы, але ёсць.


Стэнікэ, пра якога тут пойдзе гаворка, мілыя дзеці, прыкладна ваш равеснік. Надзіва розныя здарэнні з ім адбываюцца часцей, чым з іншымі. Не паспее Стэнікэ выкруціцца з адной прыгоды, як трапляе ў другую. І ўсё ж, не зважаючы на гэта, ён вясёлы і жыццярадасны. Яно, мабыць, так і лепш.

Чалавек на памылках вучыцца. Бо не кручаны — не рэмень, не вучаны — не чалавек.

Але чым спасцігаць прымаўкі на сваёй скуры, лепш вучыцца на чужых памылках.



ДЗВЕ ПАРЫ ВАЧЭЙ




Стан надзявае бабіны акуляры і бярэ кніжку.

— Папсуеш сабе вочы, хлопча,— гаворыць унуку баба.

— Як гэта папсую?! Ты ж гаварыла, што ў каго дзве пары вачэй, той вучыцца байчэй.

— Я казала зусім не так, Стэнікэ. Не той, у каго дзве пары вачэй, вучыцца байчэй, а той, хто вучыцца байчэй, мае дзве пары вачэй. Таму аддай мае акуляры, і будзем вучыць літары. Чалавека вочы водзяць, а веды пачынаюцца з азбукі, і вучаны бачыць удвая далей за нявучанага.

ВУЧЫСЯ ЗАМАЛАДУ, ТО НА СТАРАСЦЬ ЯК ЗНОЙДЗЕШ.





РАЗУМНЫЯ ПЧОЛЫ...

Стэнікэ і Дэнуц, суседскі хлопчык і сябар Стэнікэ, уважліва назіраюць пчол, якія мітусяцца каля лятка.

— Добра пчолам,— летуценна гаворыць Дэнуц.— Пералятай сабе з кветкі на кветку, мёду еш колькі хочаш, а рэшту ў вулей аднось.

— Э-ге,— уздыхае Стэнікэ,— каб кроплю мёду сабраць, трэба папалятаць...

Дэнуц пагаджаецца, але неўзабаве прыходзіць яму новая думка:

— Вось было б здорава, каб пчолы ўсе разам па ўзятак паляцелі, а вуллі засталіся без нагляду. Мы дасталі б тады па ладным кавалку сотаў...

Услед за таварышам і Стэнікэ прагна каўтануў сліну. Але нешта ўспомніў і кажа:

— Калі тата ідзе падглядваць пчол, ён укурвае анучу і з дымара акурвае пчол. Тады яны робяцца рахманыя-рахманыя.

— Давай і мы так паспрабуем,— прапанаваў Дэнуц.

І паспрабавалі. А чым усё гэта скончылася, я ўжо вам расказваць не буду...

Таму што:

НЯМА МЁДУ БЕЗ ГАРКОТЫ.

І яшчэ:

І ПЧАЛА РАЗУМНАЯ, КАЛІ САМ НЕ ДУРАНЬ.



ЯК СТЭНІКЭ ХОЧА БЫЦЬ ПРАЦАЛЮБІВЫМ

На золку звініць будзільнік. Стан падхопліваецца з пасцелі і выбягае на ганак.

Маці здзіўлена.

— Што здарылася, Стэнікэ, толькі на дзень займаецца, а ты ўжо ўстаў?

— Я хачу быць працалюбівым.

— Малайчына. Бяжы тады мыцца.

— Ай, мама, мне яшчэ спаць хочацца. Я толькі паназіраю, як узыходзіць сонца. Бо дзед казаў, што працалюбівы сустракае сонца на нагах.

НЕ СПЯШЫ ЯЗЫКОМ — ПАСПЯШАЙ СПРАВАЙ.

І:

ПАКУЛЬ СОНЦА ЎСТАНЕ, РАСА ВОЧЫ ВЫЕСЦЬ.



ХТО ГУЛЬТАЙ?

У Стэнікэ ёсць вучоны сабачка Буздуган. Буздуган у зубах умее насіць партфель.

Аднаго разу Стэнікэ вырашыў узяць Буздугана ў школу, каб пахваліцца ім перад таварышамі. Дэнуц, уведаўшы пра задуму сябра, ужо з раніцы ўзлез на вароты свайго двара і чакаў, каб праводзіць суседзяў у школу.

І вось Стан выходзіць на вуліцу. Заклаўшы за спіну рукі, ён горда крочыць папарадзе, а Буздуган з партфелем у зубах трушком спяшаецца за ім. Аднак Стэнікэ не паспявае зрабіць і дзесяці крокаў, як бачыць побач з сабой Буздугана, але... без партфеля ў зубах. Хлопчык азіраецца і хапаецца за галаву. Партфель ляжыць пасярод дарогі, а па схіле вуліцы ўніз імчыць самазвал. Стэнікэ з усіх ног кідаецца назад, падхоплівае партфель.

Калі машына праляцела побач, Стан добра-такі прабірае Буздугана за ляноту, і яны ідуць далей. Як і спачатку: Стэнікэ папарадзе, сабачка — ззаду.

Але неўзабаве Буздуган зноў дробненька перабірае лапкамі побач са Стэнікэ. Без партфеля, вядома. Зноў трэба бегчы назад.

Дэнуц аж зацекаецца ад смеху.

Стану нарэшце надакучыла беганіна. Ён выцірае ўзмакрэлы лоб, ускідвае за спіну партфель і пачынае выгаворваць Буздугану. Сабачка сядзіць ля ног хлопчыка, высунуў на цэлы локаць язык, цяжка дыша і пазірае знізу ўверх на гаспадара.

— Ага, стаміўся! З гультаямі так заўсёды бывае,— адчытвае яго Стэнікэ.

Буздуган згодна памахвае хвастом.

ТУЮ Ж САМУЮ РАБОТУ ГУЛЬТАЙ РОБІЦЬ ДВОЙЧЫ.



ЗА ДВУМА ЗАЙЦАМІ

Стан уключае тэлевізар і садзіцца выконваць урокі. Краёчкам вока зазірае то ў задачнік, то на шпіёна на экране тэлевізара. «Вось зараз яго зловяць... Зараз... Э, не — з'явіўся яшчэ адзін. Іх ужо два! І яшчэ. Іх ужо тры!.. Тры з паловай метры тканіны па чатыры рублі за метр...»

— Стэнікэ, выключы тэлевізар! — крычыць яму з кухні маці.— Не ганіся за двума зайцамі, бо ніводнага не зловіш.

«Два зайцы,— паўтарае Стан, не адрываючы позірку ад тэлевізара,— і тры з паловай метры шпіёнаў па чатыры тканіны за рубля...»

На другі дзень Стан панура цягнецца са школы — пагнаўся за двума зайцамі, а злавіў... двойку.

ВОЗЬМЕШСЯ СЕМ СПРАЎ РАБІЦЬ, НІ АДНОЙ НЕ ЗРОБІШ.

ДЗВЕ РАБОТЫ ЗА РАЗ НЕ РОБЯЦЦА.



КАЛІ НЕ ВЕДАЕШ, ШТО СКАЗАЦЬ...

Двойка ў дзённіку адцягвае партфель да зямлі, і Стан яшчэ не ведае, што сказаць маме. Сказаць праўду — значыць засмуціць яе. А хто ж хоча засмучаць маму?! Нічога, дзённік ён пакажа пазней, калі выправіць адзнаку. Але мама можа папрасіць паказаць дзённік сёння. Тады трэба адказаць, што настаўніца забрала яго праверыць. А калі ўсё ж мама знойдзе дзённік у партфелі?! Та-ак, пакуль суд ды справа, трэба яго дзе-небудзь схаваць. Скажам, у хляве.

Радасны, што прыйшла такая простая, але ўдалая думка, Стан прыпусціўся бежкам дадому.

Буздуган сустрэў яго каля веснічак і з падскокам пабег за сябрам у хлеў.

Схаваўшы дзённік, Стан выйшаў назад, а тут на парозе — мама.

— Чаму гэта Буздуган нясе ў зубах расчынены партфель? Каб хаця нічога не павыпадала з яго,— гаворыць яна.

Маці нагінаецца, забірае ад сабачкі партфель, выпрастваецца і, адчуўшы нешта нейкае, пазірае то на аднаго, то на другога.

Буздуган разумее гэта па-свойму. Ён хутка кідаецца ў хлеў і вяртаецца адтуль з дзённікам у зубах.

ШЫЛА Ў МЯШКУ НЕ СХАВАЕШ.

КАЛІ НЕ ВЕДАЕШ, ШТО СКАЗАЦЬ, КАЖЫ ПРАЎДУ.





ПРА ДАСЦІПНАСЦЬ

Стан хоча праверыць Дэнуца: ці ўмее той рашаць задачкі?!

— Скажы мне, Дэнуц, колькі ў цябе будзе, калі я табе дам дзве ігрушы, адну айву...

— Тры,— адразу ж адказвае Дэнуц.

— Пачакай, выслухай да канца: дзве ігрушы, адну айву, тры яблыкі і... дзесяць арэхаў. Колькі ўсяго разам?

Дэнуц ліхаманкава загінае пальцы, але іх не хапае. Нешта мыляе губамі, на хвілю бянтэжыцца, затым рашуча махае рукой і гаворыць:

— Дзве кішэні!.. Ну, дык давай што абяцаў. Ты ўсё мне аддасі?!

ДАСЦІПНАМУ Ў РОТ ПАЛЬЦАЎ НЕ КЛАДЗІ.

СЛОВА НЕ ВЕРАБЕЙ, ВЫПУСЦІШ — НЕ ЗЛОВІШ.





КАЛІ ДВОЕ СВАРАЦЦА...

Стэнікэ сядзіць, надзьмуўшыся, на адным канцы ганка, Дэнуц — на другім. Нешта не падзялілі. Буздуган расцягнуўся пасярэдзіне. Паклаў пысу на лапы, варушыць вушамі. Адно вока заплюснуў, а другім цікуе за хлопчыкамі — то за адным, то за другім.

— Усё роўна ён мяне больш слухае,— парушае маўчанне Дэнуц і вымае дрaбок цукру.— Зараз пабачыш. Буздуган, ка мне!

Сабачку двойчы ўпрошваць не трэба.

— Ха-ха, на цукар хто не кінецца. А вось калі паклічу я, то ён і на скарынку прыбяжыць,— гаворыць Стэнікэ і вымае сухар.


За два скачкі Буздуган апынаецца ўжо каля Стэнікэ.

Пасля Дэнуц дастае яшчэ дрaбок цукру. Затым Стан вымае кавалачак абаранка.

Радасны Буздуган бегае ад аднаго да другога і ведаць не ведае, што тая гульня, якую распачалі хлопчыкі, называецца сваркай.

ДВОЕ СВАРАЦЦА — ТРЭЦІ РАДУЕЦЦА.

ДЗЕ ДВУХ ЗВА́ДУ ВЯДЗЕ, ТАМ ТРЭЦІ КРАДЗЕ́.



У СТРАХУ ВОЧЫ ВЯЛІКІЯ

Стэнікэ і Дэнуц цёмначы не баяцца. Але адна справа не баяцца дома і зусім іншая, калі ты ў незнаёмым месцы. Таму аднойчы яны вырашылі схадзіць ноччу ў лес на ўскрай сяла.

— Можа, узяць з сабой Буздугана? — пытае Дэнуц.— Выпрабаваць яго.

— Не трэба, яшчэ ўцячэ куды,— адказвае Стан.

І вось трэба выходзіць за вароты. Раптам Дану падалося, што яму надта душна, як не горача.

— Пачакай мяне трошкі, аднясу дахаты кацавейку і адразу вярнуся.

— Пакладзі яе дзе-небудзь тут. Во ў гэтую скрыню з пяском. Каму яна трэба. А пасля забярэш,— раіць таварышу Стан і прыўзнімае вечка скрыні, што стаіць ля варот.

Дэнуц прасоўвае руку з кацавейкай у скрыню, але тут жа з маланкавай хуткасцю выхоплівае яе і стрымгалоў кідаецца ад скрыні.

— А-а-а! — крычыць ён.

Ад нечаканасці Стан выпускае з рук вечка і таксама — ходу! Услед за Дэнуцам. Буздуган выскачыў з

будкі ды давай спрасонку брахаць на іх, быццам яны якія зладзеі.

З ліхтарыкам выйшаў на ганак бацька Стэнікэ.


— Та-там у ск-крыні з пяск-ком нех-хта ёсць! — заікаецца і не можа разборліва вымавіць Дан.— У яг-го — поўсць. М-мабыць, м-мядзь-ведзь?..

Свецячы ліхтарыкам, бацька Стэнікэ ідзе ўпарадзе. Можа, і праўда мядзведзь, тады хоць раз за жыццё ён пабачыць касалапага. Бацька Стэнікэ адчыняе скрыню, свеціць туды, а на пяску зверху ляжыць — што б вы думалі? — старая зімовая шапка Стэнікэ.

— А-а-а! — збянтэжана прамаўляе Стан.— Я забыўся яе тут вясною, калі на цяпло стала.

БАЯЗЛІВАМУ І КОРЧ — МЯДЗВЕДЗЬ.
КАЖУХ ЛЯЖЫЦЬ, А ДУРАНЬ ДРЫЖЫЦЬ.





СМЕЛАСЦЬ

Да апоўначы Стану не сплюшчыць вачэй: гэта жарты табе, так абняславіцца! Неадкладна, заўтра ж, як і дамовіліся, яны праверацъ сябе на смеласць.

На наступны дзень хлопчыкам здаецца, што ім ніколі не дачакацца вечара. Нарэшце, калі добра сцямнела, рушылі ў дарогу.

Скурчаныя кусты за платамі здзіўлена шамацелі, калі хлопчыкі кіраваліся на ўскрай сяла. Яны ішлі і штосьці насвістывалі, не звяртаючы на іх ніякай увагі. На падыходзе да лесу з-за пагорка выслізнуў месяц. Сябры пачалі насвістваць яшчэ весялей. Але перш чым зліцца з цёмнай сцяной дрэў, Дан азірнуўся назад і замёр на месцы. У месячным святле на самым пагорку стаяў... воўк. Ды вялікі, з добрае цялё.

Стан імгненна ацаніў абстаноўку і коратка аддаў каманду: на дрэва! Імгненне — і ён ужо на галіне.

— Лезь хутчэй! — нецярпліва крычыць Дэнуцу.


Але сябар ушчаміўся ў нейкую ралю — ні ўзад, ні ўперад. Стан саскоквае з дрэва, падпіхвае Дэнуца ўгору, але сам ужо не паспявае другі раз узлезці на галіну. Звер — вось ён, ля самага лесу. Стан нахіляецца, каб знайсці чым-небудзь абараніцца.

— Трымайся, Стэнікэ! — падбадзёрвае яго Дэнуц і сігае з дрэва на зямлю на дапамогу.

Але ваўчына раптам спыняецца і пачынае радасна... гаўкаць.

— Буздуган! — у адзін голас крычаць хлопчыкі і кідаюцца абдымаць яго.

НЕБЯСПЕКА СМЕЛЫХ ЛЮБІЦЬ.



ПАЛАЧКІ

Дэнуц папрасіў Стэнікэ выразаць яму дзесяць лічыльных палачак.

— Гэта вельмі проста,— гаворыць Стэнікэ.— Можаш лічыць, што яны ўжо ў цябе ёсць. Глядзі і вучыся, як я гэта буду рабіць.

Стан выбраў прут, прыкінуў на вока і хуценька адрэзаў дзесяць кавалачкаў. Склаў у пучок і ўбачыў, што яны няроўныя.А тры дык зусім вытыркаюцца — занадта доўгія.

— Не бяды,— суцяшае Дэнуца Стан,— я іх падкарачу, і ўсе будуць аднолькавыя.

Рэзнуў раз, і два, і тры — і перастараўся. Аказалася, іншыя сем сталі большыя за тры падкарочаныя.

— Пачакай, Дэнуц, я хуценька падраўняю астатнія.

І так, бесперастанку падрэзваючы то адны, то другія палачкі, засталася ў руках у Стэнікэ жменька друзачак рознай велічыні.

СЕМ РАЗОЎ АДМЕР — АДЗІН РАЗ АДРЭЖ.



АД СПЕХУ НАРАБІЎ СМЕХУ

Стан з бацькам былі ў лесе. Дайшлі да ручая, трэба на той бок. Бацька паглядзеў ды і кажа:

— Давай пашукаем зручнае месца, каб перайсці.

— А навошта шукаць,— хмыкнуў Стан,— я і тут пераскочу.

Але ручай аказаўся не такі вузкі, як здаўся хлопчыку напачатку. І вось, разагнаўшыся, Стан заблы-

таўся яшчэ і ў траве і — боўць! — на самую сярэдзіну ручая...

АБАЧЛІВЫ І МОРА ПЕРАПЛЫВЕ, ГАРАЧЫ І ЛУЖЫ НЕ ПЕРАСКОЧЫЦЬ.

НЕ КАЖЫ ГОП, ПАКУЛЬ НЕ ПЕРАСКОЧЫШ.



ЯК СТЭНІКЭ ДАСПЕЛЬВАЎ АБРЫКОСЫ

Лета даўно было на пагодзе, а абрыкосы — хоць плач! — ніяк не хочуць выспяваць.

— Ім не хапае цяпла,— тлумачыць бацька, бачачы, што сын ходзіць каля зялёных яшчэ пладоў, нібы кот каля смятаны.— Пацярпі трохі.


Ага, знайшлі цярплівага, Стэнікэ так і будзе чакаць!

«Ім не хапае цяпла,— разважае ён над бацькавымі словамі.— Дык я іх зараз падагрэю».

Задумана — зроблена. Стэнікэ нарваў абрыкосаў на авечым загоне, дзе не так задзімае вецер, расклаў агонь, а сам пабег у хату ўзяць патэльню, каб высыпаць на яе абрыкосы і падагрэць на агні.

Пакуль бегаў, загарэўся авечы загон. Добра, што суседзі хутка павыскоквалі з вёдрамі, а то бя-яды было б!..

СВОЙ ЧАС ЯГАДЗЕ, СВОЙ ЧАС БАРАВІКУ.



ШТО МОЖНА ЗРАБІЦЬ СЁННЯ...

Бацька вярнуўся з поля, пачаў капаць свой агарод. Стан за ім разбіваў граблямі грудкі, а сам увесь час паглядаў у бок летняй печы. Адтуль ішоў смачны пах. Нарэшце маці пагукала вячэраць.

Стэнікэ адразу кінуў граблі, пачаў атрэпвацца.

— Давай скончым,— прапануе бацька,— засталося ж зусім мала.

Сын уздыхае, ды няма куды дзецца — бацьку не адмовіш.

Нарэшце тата ўскапаў увесь участак, а Стан разбіў за ім усе грудкі. Памыліся ды селі за стол. А тут — як яго і чакалі — пайшоў дождж. Ды такі спорны, як з вядра.

На раніцу зямля размокла, што нельга было ступіць, а пра тое, каб сёння капаць,— і не думай.

— Добра, што паспелі ўчора вечарам,— задаволены бацька.— Глядзі, як дыхае зямля. Усё роўна як чалавек — на поўныя грудзі.

КАНЕЦ — СПРАВЕ ВЯНЕЦ.
НЕ АДКЛАДВАЙ НА ЗАЎТРА, ШТО МОЖНА ЗРАБІЦЬ СЁННЯ.



ПРА ЯДУ

Маці напякла пірагоў — самі ў рот просяцца. Стан прагна есць і не можа здаволіцца.

— Не спяшайся, а то падавішся,— перасцерагае маці.— Пакінь і на заўтра.


Стэнікэ падмігвае бацьку ды гаворыць недзе пачутае:

— Не пакідай на заўтра тое, што можна з'есці сягоння.

— Хе-хе,— хітравата пасміхаецца бацька ды павучае сына:— Сённяшнюю працу зрабі сёння, а сённяшнюю ежу пакінь і на заўтра. Каб у ядзе не перастарацца. Каб людзі не казалі: як есць, дык пацее, а як працуе, дык мерзне.

НА ЕЖУ НАКІДВАЕЦЦА, ЯК ВОЎК, НА ПРАЦУ НЕ ПАВЕРНЕШ, ЯК КАЛОДУ.

ЯДУ НА ЗАЎТРА АДЛАЖЫ, А СПРАВУ СЁННЯ ЗРАБІ.



ТРЭСКА

Бацька коле дровы. Непадалёку стаіць Стэнікэ і чакае, калі тата спыніцца перадыхнуць. Тады ён спрытна падбірае паленцы і трэскі.

— Памагай бог, гаспадары,— з-за плота крычыць сусед Гіцэ.

— Дзякуй, нану Гіцэ,— адказвае бацька.

Сусед Гіцэ некаторы час назірае, як працуе Стан, і гаворыць яго бацьку:

— Выліты ты. Завіхаецца, круціцца, нібы чыжык. Нездарма гавораць, што трэска ад дзеравіны недалёка адлятае.

Бацька пагладжвае вусы ды задаволена ўсміхаецца.

ЯКОЕ ДРЭВА, ТАКІ І КЛІН, ЯКІ БАЦЬКА, ТАКІ І СЫН.

ЯБЛЫК АД ЯБЛЫНІ ДАЛЁКА НЕ КОЦІЦЦА.



ЗАЛАТЫЯ НАРУКАЎНІКІ

Стэнікэ з Дэнуцам вырашылі зрабіць Буздугану будку з акенцам. Цёплую, каб у холад і непагадзь сабачка і хваста на двор не высоўваў.

У бацькавай сталярні колькі хочаш дошак і інструменту. І хлопчыкі завіхаюцца, ажно пот градам коціцца. Але будка штосьці не атрымліваецца.

— Паслухай, Дэнуц,— праз некаторы час гаворыць Стэнікэ,— давай пашукаем татавы нарукаўнікі.

— Якія нарукаўнікі?

— Я чуў, як сусед Гіцэ гаварыў, што ў таты залатыя нарукаўнікі. Таму ў яго ўсё і атрымліваецца.

— Залатыя нарукаўнікі? — перапытвае Дан і азіраецца наўкола.— Калі звычайныя, з цёмна-сіняга паркалю,— то вось яны. А залатыя пашукаць трэба.

...На пошукі хлопцы сіл не шкадавалі. Калі прыйшоў бацька, сталярня была перавернута ўверх дном. Доўга памучыліся ўтрох, пакуль усё на месца не вярнулі. Тады бацька і кажа:

— Залатымі нарукаўнікамі, хлопцы, той валодае, хто ў звычайных працуе, але працу любіць і доўгае цярпенне мае.

Сябры згодна ківаюць галовамі, а самім так і кар-

ціць як найхутчэй пабачыць тыя нарукаўнікі. І неадкладна, цяпер!

Ад бацькі гэтага не схаваеш, ён уздыхае:

— Ну што ж, падайце мне тады мае цёмна-сінія ды пілку заадно. А самі сачыце за маімі рукамі, назірайце, як я буду працаваць, можа, і ўбачыце што.

УЗЯЦЦА НЕ ТРУДНА, ЗРАБІЦЬ ТРУДНЕЙ.
РАМЯСТВО ПЛЯЧЭЙ НЕ АБЦЯГВАЕ.
ПА РАБОЦЕ МАЙСТАР ВІДАЦЬ.



ХАРОШЫ ДЗЕНЬ

Неяк раніцай пайшоў Стэнікэ па ваду. Падышоў да калодзежа, узяўся за калаўрот, набраў вады і выцягвае. Засталося толькі пераліць у хатняе вядро. Аж бачыць: суседка ідзе.

— Добрай раніцы, нануца,— вітаецца Стан.

— Добрай раніцы, Стэнікэ. Па ваду прыйшоў?


— Ага, па ваду,— адказвае ёй Стан.— Падстаўляйце бліжэй сваё вядро, нануца, налью вам вады, а сабе яшчэ дастану.

Так і зрабіў.

— Расці вялікі, Стэнікэ,— гаворыць суседка.— Добрым чалавекам вырасцеш, бо добры дзень пачынаецца з раніцы.

ДОБРЫ ПЕВЕНЬ УЖО Ў ШАЛУПАЙЦЫ СПЯВАЕ.

ДАБРЫНЯ ЗАЧЫНАЕЦЦА ДОМА, АЛЕ ТАМ НЕ ЗАКАНЧВАЕЦЦА.



ЯК АУКНЕШ...


Стан дастае яшчэ вядро вады, але калі хоча пераліць, зноў бачыць суседку.

— Наліць вам яшчэ, нануца? — пытаецца хлопчык.

— Дзякуй, Стэнікэ, мне больш не трэба. Прынесла табе ігрушу. Даспяваюць ужо,— гаворыць суседка і кладзе ігрушу я́му ў кішэню.

— Дзякуй і вам, нануца,— дзякуе Стан, трымаючы калодзежнае вядро з вадой у руках.— У вас вельмі салодкія ігрушы...

ДАБРО АД ДАБРА НАРАДЖАЕЦЦА.
ЯК АУКНЕШ, ТАК І АДГУКНЕЦЦА.



ДЗЕДАЎ ПОСАХ

Стан прыйшоў праведаць дзеда, папытаць пра яго здароўе і жыццё.

— Вось трэба перасадзіць арэшак, што вырас пасярод агарода. Ён там не на сваім месцы. Будзе зацяняць усё вакол сябе,— гаворыць дзед, а далей скардзіцца ўнуку:— А мяне так схапіла сярэдзіна, што сагнуцца не магу.

Стан бярэ ў рукі рыдлёўку.

— Я яго перасаджу, дзеду, а ты мне толькі падказвай — як!

— Добра, дам табе ў памочнікі свой посах, і ты будзеш ведаць — як,— пагаджаецца дзед.

Унук здзіўлена пазірае на посах у дзедавых руках, але ні пра што не пытаецца.

Дзед тым часам выбірае для маладога арэшка месца паўз плот ля дарогі, недалёка ад старога арэха, гаворыць:

— Сюды вось мы яго і перасадзім. Гэтага старога пасадзіў яшчэ бацька майго бацькі. Моцнае дрэва

было. Мабыць, яно вытрымае і яшчэ некалькі гадоў, пакуль гэты малыш пачне пладаносіць.

Стан выкопвае ямку, прыносіць вядро гною, у другім вядры — дажджавой вады, што ў бочцы пад стрэшкай, дабаўляе трохі гліны, перамешвае, прыладжвае дрэўца, засыпае зямлёй, зноў палівае вадой, прысыпае, утрамбоўвае...

Нарэшце, калі дрэўца самавіта стаяла на новым месцы, быццам там і вырасла, хлопчык з палёгкай уздыхае, і тут яму ўспамінаюцца дзедавы словы пра посах.

— Ой, дзеду, а ты ж забыўся даць мне ў памочнікі свой посах.

— Не, не забыўся. Я яго даў табе, Стэнікэ, даў,— адказвае дзед.— Парада старога і ёсць посах для маладога.

СЛУХАЮЧЫ СТАРЫХ, РЫХТУЙ ВУШЫ, А НЕ ЯЗЫК.

ТОЙ, ХТО ГАВОРЫЦЬ,— СЕЕ, ТОЙ, ХТО СЛУХАЕ,— ЖНЕ.





ВУЧЫСЯ І Ў ДРЭВА...

Стары арэх пачынае ціха шалясцець. Дзед прыкладвае да вуха далонь, услухоўваецца.

— Ён нешта кажа, дзядуля? — пытаецца здзіўлены Стан.

— Кажа, унучак,— ківае галавой дзед.— Як жа яму не казаць, калі ён — жывы.

— А што ён гаворыць?

— Наказвае малышу, каб не забываў пра чалавечае дзіцяня. Пра цябе, значыць.

Ненадоўга дзед услухоўваецца зноў.

— А цяпер што ён яму сказаў?

— Сказаў, каб вучыўся любіць працу ў чалавечага дзіцяняці.

Стэнікэ зардзеўся ад гордасці.

— Я кожны дзень буду паліваць яго і пастаўлю яму апору...

— Памаўчы, памаўчы крышку. І яшчэ гаворыць стары арэх маладому, каб навучаў і цябе...— дзед перапыняецца, слухае.

— А чаму можа навучыць мяне дрэва? — здзіўлена пытаецца хлопчык.


— Шмат чаму, Стэнікэ, шмат чаму,— адказвае дзед і паволі накіроўваецца да дома, абапіраючыся адной рукой на посах, другой — на плячо ўнука.— У першую чаргу дабрыні і шчодрасці. Ану, скажы: ці ёсць такое дрэва, каб пладаносіла толькі для сябе?

— Я не ведаю такога.

— Вось бачыш.

Дзед прысеў на парог. А Стан бегма кінуўся ў агарод. Стары арэх заўважыў яго здалёк, пачаў шалясцець вещцем. Хлопчык падышоў да дрэва, прыклаў далонь да вуха, нахіліўся да камля і пачаў слухаць.

І Ў ДРЭВА ВУЧЫСЯ БЫЦЬ ЧАЛАВЕКАМ.



КАЛІ ДЗІЦЁ ВЫЦЕЛА ПАЛЕЦ

Стан упаў з дрэва і выцеў палец. Ён мог бы тут жа ўстаць — хіба гэта першы раз. Але позна ўжо: мама і дзядуля бачылі, як ён гракнуўся, і бягуць да яго, аж ногі ломяцца. А Стан ліхаманкава думае: калі скажаць, што нічога не баліць, то абавязкова атрымае

пару аплявух. А калі скажа, што баліць, мама яго пашкадуе, прылашчыць — на тым і скончыцца.

Стэнікэ пачынае стагнаць.

— Што з табой, галубок? Дзе баліць? Хаця рукіногі цэлыя?..

Стэнікэ стогне і паказвае палец, які нават не пачырванеў.

Маці садзіцца на траву і аж вочы заплюшчвае ад жаху. Кажа:

— Божухна, ледзьве сэрца не разарвалася...

Але праз хвіліну апамятваецца, ускоквае, хапае Стэнікэ з зямлі і пляскае некалькі разоў туды, куды трэба. Ажно пыл са штонікаў курыць.

— Вось табе, во так! Будзеш ведаць другі раз, як лазіць па дрэвах.

Маці пайшла, а Стэнікэ румзае. Так, дзеля прыліку. Ён застаўся з дзедам. Стэнікэ перастаў плакаць. Некаторы час абодва маўчаць, пасля моўчкі ідуць услед за маці.


— Дзедка, а чаму мама сказала, што ў яе магло парвацца сэрца? Не яна ж упала з дрэва!

— Ды так яно спакон веку, унучак,— адказвае дзед.— Дзіця палец вытне, а ў маці сэрца баліць.

МАТКА КРЭПКА ЗАМАХНЕ, А ПАМАЛЕНЕЧКУ ВЫТНЕ.

ДОБРАЕ ДЗІЦЯ ДУМКІ БАЦЬКОЎ ЗГАДВАЕ.

УЗЯЦЦА НЕ ТРУДНА...



Чым даўжэй Дэнуц працуе, тым часцей пачынае азіраца.

— Стэнікэ,— звяртаецца ён да сябра,— а наша дзялянка, відаць, большая за дзедаву. Вунь колькі працуем, а яна не меншыцца, а быццам расце.

Стэнікэ таксама азіраецца. І праўда, шмат паразбівалі грудак на загоне, а да мяжы ой як далёка. Але ж і расці яна не можа.

— Гэта так здаецца,— супакойвае ён сябра.— Вунь і калкі ўсе на месцы.

Дэнуц падступае бліжэй да Стэнікэ і шэпча яму на вуха:

— А можа, іх перастаўіць? Мы дзеда пакрыўдзілі: сабе адмералі большую дзялянку, чым яму.

Стэнікэ ў нерашучасці. Заплюшчвае вочы, думае. І раптам бачыць перад сабой засланы стол, а на ім — смажаніна, смятана. Пасярэдзіне паруе мамалыжка, а вакол стала пасела ўся сям'я і здзіўляецца: «Няўжо ўсё, што тут ёсць, дзеці напрацавалі?!»

— Калкі бліжэй перастаўляць не будзем,— гаворыць Стэнікэ.— Не так многа той працы і засталося, як здаецца. Паразбіваем грудкі, трошкі перадыхнём. А сеяць — гэта ўжо няцяжка.

Дэнуц з неахвотай бярэ граблі, якія з кожным разам як падняць. А сам сабе думае, што можна бы-

ло б перадыхнуць і цяпер, калі сеяць будзе не так ужо і цяжка, як кажа Стэнікэ.

Дзядуля тым часам працуе без перапынку. І прытвараецца, што быццам не разумее, пра што шэпчуцца хлопцы.

Вось яны нарэшце з вялікім намаганнем дайшлі да мяжы, пападалі на зямлю каля дальняга калка і з цікавасцю разглядваюць свае далоні.

— Малайцы хлопцы,— задаволены імі дзед.— Ведайце, што:

УЗЯЦЦА НЕ ТРУДНА, ЗРАБІЦЬ ТРУДНЕЙ,

і помніце:

КАНЕЦ — СПРАВЕ ВЯНЕЦ.





ДВА ЗЯРНЯЦІ, ДЗВЕ ФАСОЛІНЫ

Дзед выносіць з пограба адну міску з фасоляй, другую — з вымачанымі зярнятамі кукурузы.

— Я патрымаў іх два дні ў вадзе, каб пусцілі расткі,— тлумачыць дзед.— Так яны хутчэй узыдуць.

— Па-мойму, хтосьці гаварыў,— пачынае па-даросламу гаварыць Стэнікэ,— што мамалыга смачная са смажанінай, а не з фасоляй.

— Са смажанінай смачная і фасоля, пасадзім і фасолю. Тым больш што яны добра растуць разам з кукурузай — фасоля ўзбіраецца на сцябло кукурузы, і ніякай падпоркі не трэба,— тлумачыць дзед.— Але калі вам не хочацца, можаце садзіць адну кукурузу, дзялянка ж у вас свая.

— Не, дзедка, калі фасоля добра расце разам з кукурузай,— гаворыць Дэнуц,— пасадзім і фасолю.

Дзед выкопвае некалькі ямак.

— Рабіце так, дзеткі: адзін капáе ямкі, другі кідае ў іх па два зярняці кукурузы і па дзве фасоліны.

— А чаму па дзве? — цікавіцца Дэнуц.

— Каб пэўна было, што ўзыдуць,— адказвае дзед.— Можа трапіцца каторае зярнятка нягожае, пустое, пашкоджанае насякомым...

Праца закіпела.

— Цікава саджаць,— зазначае Дэнуц.— І лічыць лёгка: два зярняці, дзве фасоліны...

— Не спяшайся! — накідваецца на яго Стэнікэ.— Не сып усё ў адну ямку таму, што лёгка лічыць.

Дзед саджае побач на сваёй дзялянцы.

— Дзедка, мы зараз скончым і прыйдзем табе памагчы,— запэўнівае яго Стэнікэ.

Першую градку хлопчыкі засадзілі хутка. Другой, якую капае Дэнуц, здаецца, і канца не будзе. На трэцяй справы ідуць яшчэ марудней. Ну, а на чацвёртай дзеці не могуць зразумець: навошта ім столькі кукурузы і фасолі, калі будуць смажаніна і смятана?

Добра яшчэ, што дзед, не чакаючы, калі дзеці прыйдуць яму дапамагчы, управіўся на сваёй дзялянцы сам. А закон ёсць закон: хто раней упраўляецца, той ідзе на помач суседу.

Ого, з дзядулем працаваць — адна асалода: раз-два — і ямка гатова. А побач Стэнікэ: раз-два — і другая ямка выкапана. Дэнуц ледзьве паспявае лічыць за імі: два зярняці, дзве фасоліны, два зярняці, дзве фасоліны...

Калі нарэшце скончылі, то дзеці былі ажно мокрыя.

— Нічога, гэта няблага,— гаворыць дзед.

ХТО ПАЦЕЕ ЎЛЕТКУ, ТОЙ НЕ ГАЛАДАЕ ЗІМОЙ.



ХТО ДБАЕ...

Ведаеце, што смачнейшае за ўсё на свеце?

Не, не, самае смачнейшае на свеце — малады катах кукурузы, спечаны на вуголлі. Калі не верыце, спытайце ў Стэнікэ і Дэнуца. Бо яны паспелі ўжо з'есці па пары катахоў ледзьве не з храпкамі. А па трэцім ядуць ужо не спяшаючыся.

Дэнуц перакідвае з далоні на далонь румяны катах і гэтак старанна нюхае яго, што апякае кончык носа.

— Дзедка, я садзіў па два зярняткі, а чаму на катаху іх столькі многа?

— Падумайце і ты і Стэнікэ разам: па два зярняці зямля вярнула вам як доўг...

Дзеці вылузваюць па два зярняці і кідаюць іх у рот.

— Па дзесяць,— працягвае дзед,— за кроплі поту, калі вы разбівалі грудкі.

Хлопчыкі вылузваюць яшчэ па дзесяць зярнят і кідаюць іх у рот услед за тымі двума.

— Яшчэ па дзесяць — за мазалі, што намулялі на далонях, калі палолі грады і выдзіралі пустазелле.

— Пачакай, дзядуля, дай пажаваць,— мармыча Стэнікэ, бо ў яго повен рот.

Дзед паварушвае вуголле, пераварочвае катахі, каб яны роўна румяніліся. Гаворыць далей:

— І яшчэ па дзесяць за кроплі вады, якімі вы палілі кукурузу, калі цэлы тыдзень не было дажджу. Ну, колькі вы там налічылі?

Дзеці пазіраюць з непаразуменнем: яны неяк і не падумалі, каб лічыць. Спяшаючыся жуюць, а самі думаюць: што адказаць.

— Налічылі шмат,— аблізваючыся, кажа Дэнуц.— Але яшчэ болей зярнят застаецца на катаху. А яны за што?


Дзед зноў паварушвае вуголле.

— А за тое, дзеткі, зямля дае вам, каб не забывалі яе і ў наступным годзе. Бо

ЗЯМЛЯ ДЗЯКУЕ РУПЛІВЫМ,

а

ХТО ДБАЕ, ТОЙ І МАЕ.





БАРАЗНА НА ГАЛАВЕ

Дзед разам з Дэнуцам і Стэнікэ ідзе рыхліць зямлю — пасля асенняга ворыва засталіся на полі вялікія глыжы.

Утрох яны пачынаюць працаваць.

— Э-ге,— гаворыць дзед,— шчаслівы той чалавек, які мае сваю зямліцу.

Стэнікэ разбівае некалькі грудак і абапіраецца на матыку.

— Дзядуля, а ты і нам выдзелі па градцы. Няхай і ў нас будзе свая зямля.

Дзед уважліва пазірае спачатку на Стэнікэ, затым на Дэнуца і гаворыць:

— Што ж, хай будзе па-вашаму. Ідзіце сюды. Калі вы захацелі зямлі, я дам вам яе па законах продкаў.

Ён высякае рыдлёўкай у дзёрне квадрат. Падрэзвае яго знізу, падымае і злёгку атрэсвае зямлю, кладзе сабе на галаву травою ўніз.

Дзеці сталі дыханне.

А тым часам дзед ідзе ўперад з дзёрнам на галаве, адмервае дзесяць крокаў уздоўж мяжы і асцярож-

на кладзе яго травою ўгару. Хлопчыкі з рыдлёўкамі прыйшлі за ім следам.

— Тут і будзе ваш межавы знак,— гаворыць дзед.— Так рабілі нашы прадзеды, калі дзялілі зямлю, і завядзёнка гэта называецца «з дзёрнам на галаве». Цяпер я вам перадаў дзёран, а разам з ім і ўсе клопаты пра выдзелены загончык.

Стэнікэ бярэ рыдлёўку.

— Давай, Дэнуц, прынясём яшчэ тры дзярніны і пакладзём іх па вуглах.

Але дзед перапыняе яго:

— Так нельга. Закон даўніны гаворыць, што дзёран трэба пераносіць толькі на сівых валасах.

Хлопчыкі зачаравана пазіраюць на яго срэбраную галаву. Дзедавы валасы перасыпаны зялёнымі былінкамі і крупінкамі зямлі. І раптам ім здаецца, што дзядуля сам падобны на гэту старажытную зямлю.

У РОДНАЙ ЗЯМЛІ МОЦ І СІЛА.
МАЛАДОМУ НАВУЧЫЦЦА, СТАРОМУ НЕ ЗАБЫЦЦА.





КАРАНІ

Узнімаецца вецер. Стану здаецца, што саджанец арэха, які ён нядаўна пасадзіў, вельмі нізка хіліцца долу.

— Хаця б не паламаўся,— гаворыць ён дзеду.

— А ты прыстаў падпорку. Пакуль ён малы, без падпоркі не абысціся.

Стэнікэ выбірае прут, глыбока ўтыкае яго каля дрэўца і прывязвае арэх.

— Вось і ўвесь клопат,— кажа дзед.— Хутка павінна прыняцца карэнне, тады ніякі вецер яго не паваліць.

Хлопчык пазірае на саджанец, на стары арэх, пра штосьці думае.

— Дзедка,— гаворыць ён,— а чаму ў мяне няма каранёў? Калі раптам здарыцца велізарная бура, то...

Дзед сам сабе пасміхаецца.

— Тады будзеш трымацца за мяне,— гаворыць ён.— І за маму. І за тату. І за ўвесь наш род. Таму што

ДРЭВА ТРЫМАЕЦЦА КАРАНЯМІ, А ЧАЛАВЕК СВАІМ РОДАМ.




БЫВАЛЫ ЧАЛАВЕК — РАЗУМНЫ ЧАЛАВЕК

Пачуў Стэнікэ такую прымаўку: «За аднаго бітага двух нябітых даюць» і задумаўся.

Эге, значыць, за мяне можна двух малойцаў выменяць. Я ж вунь у якія прыгоды трапляў. Нездарма Бывалым Чалавекам празвалі. А яшчэ кажуць: «За аднаго вучанага сем нявучаных даюць». Выходзіць, я яшчэ ў дадатак і самы разумны? Не-е, тут штосьці не тое. Бо калі б было так, то людзі празвалі б мяне Стан-Разумны, а не толькі Стан-Бывалы Чалавек.

Стэнікэ сціплы хлопчык.

А гэта — найперш.


Ад студзеня
да снежня



СТУДЗЕНЬ
(Януарые)

Захутаны ў калматы снежны кажух Просінец — яшчэ і так называюць у Малдавіі Студзень — пахаджвае ўзад-уперад па полі і думае пра злы лёс, што выпаў на яго долю між астатнімі братамі-месяцамі. Толькі што праводзіў каляднікаў, якія пажадалі яму жыць-пажываць ды квітнець-расцвітаць. Дзівакі! Ну як яму расцвітаць, калі трэба зусім іншым займацца? Шчасліўчыкі Чэрвень, Ліпень, Жнівень... Яны румяняць клубніцы, салодзяць чарэшні і яблыкі, спеляць збажыну... Эх, долечка! — свіснуў у роспачы Просінец і так хапіў шапкай вобзем, што аж сняжынкі ўзвіхурыліся.

— Ой, выратуй нас, Просінец,— аднекуль знізу пачуў ён раптам нейчую просьбу.

— Гэй, хто там, што здарылася? — пытае ён і стукае посахам у скамянелую зямлю.

— Гэта мы — азіміна, рунь... Пячэ нас паўночна-ўсходні вецер, сушыць мароз... Ратуй нас, Просінец...

Просінец трошкі памарудзіў, абдумваючы, што яму рабіць, затым здагадаўся, чаго ад яго хочуць. Зняў з сябе неабдымны снежны кажух і з краю ў край акрыў ім усё поле.

МНОГА СНЕГУ — МНОГА ХЛЕБА.
СНЕЖНЫ СТУДЗЕНЬ — ПОЎНЫЯ ЗАСЕКІ.



ЛЮТЫ
(Февруарые)

Прыняўшы гаспадарку, Люты скрушліва пахітаў галавой:

— Здаецца мне, цераз пень-калоду папрацаваў мой браток Студзень. Калі і я так пастараюся, то людзі на нас будуць паказваць пальцамі і зваць абібокамі. Зіма на зыходзе, а мы нічога не зрабілі.

І такія Люты прыпусціў маразы, што ноччу ў лесе трашчалі дрэвы, а ў небе ў зораў выцінала слязу.

— Ох жа і лютая натура ў гэтага другога месяца года,— скардзілася адна скала з патрэсканымі ад марозу губамі другой.— Калі б у яго было нават і каменнае сэрца, то і тады не быў бы такі люты.

— А ў яго сэрца, пэўна, няма,— кректануў пастарэчы ўсівелы дуб.

Пачуў гэтыя размовы Люты і падумаў услых:

— Няўжо і сапраўды ў мяне сэрца няма зусім?!

— Зусім, зусім, зусім! — жаласліва пацвердзіла берасцянка.

— Не такі я ўжо і бессардэчны, як вы думаеце. І мне крыўдна такое чуць. Калі ж так надакучыў, ма-

гу і пайсці. Нават не дабыўшы тэрміну. Мае два-тры дні няхай застаюцца брату Сакавіку.

І пакрыўджаны Люты здаў вахту дачасна. Адтуль так і вядзецца: Люты дзе на два, дзе на тры дні карацейшы за астатнія месяцы.

ПЫТАЕ ЛЮТЫ, ЦІ ДОБРА АБУТЫ.
ЯКАЯ НІ ХАЛОДНАЯ ЗІМА, А ТОЛЬКІ Б ЛЮТЫ МІНУЎ.
ЛЮТЫ НАРОБІЦЬ ПЛЮТЫ.



САКАВІК
(Марціе)

Сакавік наважыўся зрабіць сюрпрыз сваім сынам і дочкам — Ясным Дзянёчкам, наважыўся напярэдадні вясны падарыць кожнаму на шчасце па белаcінім званочку сон-травы. Ужо і з Сонцам дамовіўся, што яно згоніць снег там, дзе званочкі павінны вырасці.

Усё ішло належным чынам, а тут раптам з'яўляецца старэйшы брат Люты і пакідае яму некалькі сваіх дзён. Сакавік напачатку з радасцю іх прыняў,

а разабраўшыся, што да чаго, спахмурнеў. Люты пайшоў, яго дні яму назад не вернеш.

З Сонцам дамоўлена, што вясна настане пасляпаслязаўтра. Але ж калі Люты перадаў яму, Сакавіку, свае апошнія дні, то, значыць, яна павінна пачацца заўтра. Не, нават сёння апоўначы, і ён мае ў запасе толькі палову ночы. А што можна зрабіць за паўночы?

Беднаму Сакавіку няма куды падзецца. Сонца расцвеціць званочкі сон-травы толькі пасляпаслязаўтра, а яны яму трэба нараніцу. Паўздыхаў Сакавік, што так атрымалася, ды сам сеў іх шыць. Усю ноч вачэй не сплюшчыў. Спяшаўся надта, таму шмат разоў укалоўся. На званочках там-сям засталіся кропліны крыві. І ўсё ж паспеў!

Сынам і дочкам — Ясным Дзянёчкам — спадабаліся марцішоры — так раніцай яны назвалі кветкі сон-травы, пашытыя бацькам. Усе папрыколвалі званочкі сабе на грудзі ды так і хадзілі, аж пакуль не зацвілі дрэвы.

У САКАВІКА ВОЧЫ ПАКОРЛІВЫЯ, АЛЕ СОНЦА ЗУБАСТАЕ.





КРАСАВІК
(Апрыліе)

Красавік мае дваццаць дзевяць дачушак і толькі аднаго сынка. Так урадзіліся яго дзеткі. Дачушкі — хваліць не перахваліць: і паслухмяныя, і ўвішныя, і гаспадынькі. Дзяўчаткі здатныя, адным словам. А сынок — што стрыгунок у чарадзе. Няцяжка ўявіць, які свавольнік расце, калі адзін сярод дваццаці дзевяці і яму ўсё дазволена.

А яшчэ бацькава сляпая любоў. Бацька беражэ яго мудрэй як зрэнку вока. Ведама, наследнік, прадаўжальнік роду, носьбіт прозвішча і традыцый.

Таму наследніку хваста толькі і не хапае. Ён дурэе, гаворыць абы-якія словы, пад выглядам жартаў абдурвае ўсіх навокал... Людзі смяюцца з яго, як з блазна.

Адзіны ў бацькі сынок і той спешчаны. А завуць яго — Дзень Першага Красавіка.

КРАСАВІК — МАНЮКА.
ВЯСНА КРАСНА НА ЎВЕСЬ СВЕТ.



МАЙ
(Май)

Настаў Май.

Ускрай поля, па суседству з Парасткам будучага пшанічнага каласка расла Кветка. Надвор'е стаяла сухаватае, і Парастку не вельмі добрылася.

— Няшчасны,— спачувала Кветка,— ні постаці ў цябе, ні каласка адметнага... Чалавек на цябе ніякай увагі не зверне.

Парастак маўчаў. Яму нельга было растрачваць сілы, бо іх заставалася мала.

Аднаго разу прыйшоў Чалавек. Кветка нецярпліва затрапятала пялёсткамі, але Чалавек быццам і не заўважыў яе — засмучаны схіліўся над кволым Парасткам, пагладзіў яго і цяжка ўздыхнуў.


Пакрыўджаная Кветка згарнула пялёсткі і здзіўлена паглядзела ўслед Чалавеку.

Мінула, аднак, нямнога часу, і паліў дождж. Спакойны, спорны. Ён ішоў увесь дзень і ўсю ноч. Пшанічны Парастак увачавідкі акрыяў, набраўся сілы і выкінуў дужы колас. Кветка злёгку панікла і з горыччу падумала, што і на гэты раз Чалавек, які ўжо ішоў на поле, яе не заўважыць.

Але Чалавек яшчэ здалёк убачыў падужэлы Каласок, а калі параўняўся з Кветкай, нагнуўся і з любасцю пагладзіў яе.

«Ніколі не зразумееш гэтых людзей»,— падумала Кветка, так і не разгадаўшы думак Чалавека і тых пачуццяў, якімі ён цяпер жыў.

МАЙСКІ ДОЖДЖ НА ЎРАДЖАЙ.
БУДЗЕ ДОЖДЖ ІСЦІ, БУДЗЕ ХЛЕБ РАСЦІ.



ЧЭРВЕНЬ
(Юніе)

У першую ж раніцу, як толькі ўзялося на золак, Чэрвень з'явіўся перад Сонцам.

— Ваша светласць,— пачаў ён,— памажыце мне хутчэй пазнаходзіць усе чарэшні — ад малой да вялікай.

Сонца здзіўлена ўзняло бровы, аднак нічога не адказала, а пачало старанна выконваць просьбу Чэрвеня.

Натаміўшыся ад такой карпатлівай працы, Сонца ў абед схавалася за хмару перадыхнуць. Там і спытала ў Чэрвеня:

— Скажы, калі ласка, чаму трэба так спяшацца, у цябе ж уперадзе яшчэ столькі дзён?

— Дзён і праўда яшчэ хапае,— пачаў Чэрвень,— але зразумей і мяне. У дзяцей пачаліся канікулы, яны цэлы год старанна вучыліся. Чым жа мне пачаставаць іх за гэта як не чарэшняй?!

Сонца згодна кіўнула галавой, хутка выйшла з-за воблака і зноў разліло праменне па гарах і долах, раўнінах і пагорках. Каб нідзе не згубілася ніводная спелая ягада, а недаспелая каб налілася яго, сонечным, сокам.

ВЯСНА КРАСНА КВЕТКАМІ, А ЛЕТА — САДАВІНОЙ.



ЛІПЕНЬ
(Юліе)

Не даў Чэрвень Сонцу перадыхнуць, як Ліпень перахапіў яго. Сонцу, праўда, і не прывыкаць. Нарадзілася яно ў вёсцы і, як усе хлебаробы, улетку не мае спачыну. Які спачын, калі ліпеньскія палі так і шалясцяць налітым калоссем? Трэба старацца не на жарт, каб усё як мае быць выспеліць. Таму Сонца працуе ад світанку да цямна. Толькі ноччу дазваляе сабе перадыхнуць, каб жабы ў возеры не папарыліся.

Падзьмуў ветрык і паказытаў вусы каласоў.

— Сон-ца ў зе-ніт, ко-лас зві-ніць! — заспяваў вецер і памчаўся, разгарачаны, на машынны двор паведаміць гэту вестку людзям.

Там даўно напагатоў стаялі камбайны, чакалі каманды. Адзін за адным выязджаюць яны на дарогу. Уперадзе едзе новы камбайн, толькі з завода. Пабліскваe яшчэ неспацелай фарбай. Таму ён і самы няўрымслівы — на першым жа полі апускае хедэр, каб жаць.

— Ой, што ты робіш?! — захвалявалася поле яравой пшаніцы.— Мае зярняты яшчэ не зацвярдзелі, хіба іх можна на глум пускаць?! Паглядзі насупраць, там — азімая пшаніца, яна цябе чакае.

Новы камбайн прыкра чмыхнуў. Сапраўды, як ён мог пераблытаць яравую пшаніцу з азімай. Праўду кажуць: паспяшыш — людзей насмяшыш.

ЛЕТНІ ДЗЕНЬ — ВОЗ ПШАНІЦЫ.

ЛЕТА ПРАГУЛЯЎШЫ, ВОСЕННЮ НЕ ЗБЯРЭШ.





ЖНІВЕНЬ
(Аугуст)

Наглядзеўшыся вакол сябе на залатое багацце лета, Жнівень і ўзрадаваўся і занепакоіўся.

— Пачакайце, браты-месяцы, хіба можна так? — звярнуўся ён да мінулых месяцаў.— Я ж не абібок, які прыходзіць на ўсё гатовенькае.

— Не хвалюйся, Жнівень,— супакоіў яго Ліпень,— у цябе будзе столькі работы, што толькі б здароўя хапіла.

Жнівень агледзеўся, паспакайнеў і самавіта закасаў рукавы. Падсаладзіў вінаград, ачысціў арэхі, сабраў яблыкі і грушы, выбіў з шапак сланечніка семкі... Многа розных работ было, а адна заўсёды побач з астатнімі стаяла — сяўба! Жнівень сеяў азімыя пад будучы ўраджай.

Закончыў палявыя работы і ўзяўся дашываць дзецям у школу касцюмчыкі, ладаваць партфелі. Канікулы ж канчаліся, падступаў Дзень ведаў.

У ЖНІЎНЯ ТРЫ КЛОПАТЫ: І КАСІЦЬ, І АРАЦЬ, І СЕЯЦЬ.

РАБОТЫ СЛОВАМ НЕ ЗАМЕНІШ.



ВЕРАСЕНЬ
(Септэмбрые)

У першы свой дзень Верасень ніколькі не здзівіўся, што ўсе дзеці папрачыналіся задоўга да званка будзільніка. Хуценька памыліся, апрануліся ў новыя касцюмчыкі, узялі партфелі, ранцы, па букету кветак... А школьны званок усё маўчаў, быццам яму язык прывязалі. Хаця хто ведае, можа і такое нехта прыдумаць. Хуценька ў школу!

Глядзяць, а званок на стале ў калідоры сам ледзьве не звініць ад нецярпення. Гадзіннік жа на сцяне адно шыкае на яго: маў-чыш — маўчы, маў-чыш — маўчы...

— Чаму маўчаць, людцы добрыя, калі сёння — першае верасня?! — выгуквае нехта смялейшы. Схапіў званок і куляй вылецеў на ганак.

Пачула ясны і гучны голас званка лісце на дрэвах. Пачало перашэптвацца: «Шпарка прыйшлі шаноўныя дзеці ў школу. Пара нам парашутыраваць, кружыць і апускацца на зямлю. Можа, у гербарыі патрапім, бо хутка падзе іней...»

Некаторы час Верасень з замілаваннем слухае

прызыўны голас званка. Пасля нешта ўспомніў і рашуча заявіў:

— З сённяшняга дня каб я не чуў, што мяне называюць месяцам насмарку. Хай усе ведаюць: з гэтай мінуты я — Месяц Званка!

У ВЕРАСНІ АГОНЬ У ПОЛІ І Ў ХАЦЕ.
ЖУРАЎЛІ ЛЯЦЯЦЬ ВЫСОКА — ЗІМА ЯШЧЭ ДАЛЁКА.



КАСТРЫЧНІК
(Актомбрые)


Світанак выдаўся золкі. Мо таму бурачнае поле прачнулася раней як звычайна. І — о дзіва! Прыбранае, быццам вэлюмам маладой.

— Што гэта? — здзівіўся адзін таўсматы і надта нецярплівы бурак, што лабатай галавой вытыркаў з зямлі.— Хто гэта пасыпаў нас цукрам? Нам ад яго і так млява, бо напоўнены ад карэньчыка да самай макаўкі. А можа, гэта пудра? Тады трэба хоць трохі працерці свой замурзаны твар.

— Ой! — адразу схамянуўся ён.— Дык гэтая пудра халодная. Няўжо прыйшла зіма, а нас у полі забылі?!

— Не хвалюйся, брацік,— супакоіў яго сусед.— Гэта Кастрычнік прыйшоў. Ноччу ён і прыпудрыў нас інеем. Бо сёння мы павінны пайсці на завод на экскурсію.

ВОСЕНЬ НА РАБЫМ КАНІ ЕЗДЗІЦЬ.
КАСТРЫЧНІК УКРЫВАЕ ЗЯМЛЮ ДЗЕ ЛІСЦЕМ, ДЗЕ СНЯЖКОМ.



ЛІСТАПАД
(Наембрые)

Застаўшыся за апошняга асенняга гаспадара, Лістапад ні на мінуту не прысядзе: назапашвае вільгаць пад будучы ўраджай, цягае ўгнаенні, арэ, дзе засталося... Трактары кашляюць, едучы на гару, чмыхаюць, з'язджаючы з гары, а каб пастаяць, то няма часу.

«Цяжкавата ім даводзіцца — зямля размокла,— спачувае Лістапад.— Трэба падсобіць ім марозікам».

І застываюць дарогі, застываюць палі... Трактары перастаюць кашляць, перастаюць чхаць і працуюць спраўна, аж дымком папыхкваюць.

Выпадкова Лістапад азірнуўся і ўбачыў, што з сяла да возера беглі хлопчыкі. Занепакоіўся.

«Вось табе і на,— пачаў разважаць ён,— у адным месцы залапіш, у другім ірвецца. Іх трэба неяк вярнуць назад, бо калі пушчу на тонкі лядок, будзе бяда».

— Гэй, хлопцы! — гукае Лістапад.

Хлопчыкі спыніліся.

— Ану, скажыце мне, ці ведаеце вы такую калядку, каб яе ўсё сяло спявала?

Для хлопчыкаў такое пытанне нечаканае. Да Новага года ўга як далёка, а гэты шызы дзед пра калядную песеньку пытае.

А дзед не адстае:

— Справа ў тым, што думаю вывесці дванаццаць трактароў і наладзіць свята плугароў — Плугушор. Каб вестка пра яго разнеслася па ўсім краі. Не сягоння-заўтра павінен з'явіцца мой малодшы брат Снежань, а я пайду калядаваць. Думаў і вас узяць з сабой, але калі вы не хочаце...

Хлопчыкі аж раты паразяўлялі ад здзіўлення: чаму гэта яны не хочуць калядаваць?!

— Ну, калі згода,— гаворыць дзед,— тады бяжыце назад. І пакуль я буду заняты Плугушорам, каб вывучылі вялікую калядку, як... як...

— Як ваш плуг! — хорам падказваюць хлопчыкі і наперагонкі імчаць назад у сяло.

ДАЙ ЗЯМЛІ, І ЯНА ТАБЕ ДАСЦЬ.
БЕЗ ПРАЦЫ НЕ БУДЗЕ ШЧАСЦЯ.



СНЕЖАНЬ
(Дэчэмбрые)

Дзядуля Снежань вельмі любіць казкі. І слухаць, і сам расказваць. Падумаўшы, то і праўда: што яму рабіць? Пасевы не тонуць у пустазеллі, збожжа ў полі не асыпаецца... Калі ўжо на тое пайшло, ён сам сабе можа прыдумаць казку.

Апоўначы, пасля таго як праводзіў свайго старэйшага брата Лістапада, дзед Снежань узяў ды прыбраў зямлю так, што нават Сонца, калі раніцай прачнулася, не пазнала яе. Лес быў повен сярэбраных замкаў, розных загадкавых цудаў. А зверху ўсё ішоў ды ішоў снег.

Маладзенькія елачкі працягвалі свае лапкі, каб на ляту пераняць кожную сняжынку. Відаць, так яны хацелі схавацца ад злой Сякеры, што прывалачэцца па іх пад Новы год.

— Не бойцеся, маленькія,— супакойвае іх стары Снежань,— ведайце, што з заўтрашняга дня выходзіць новы закон, які забараняе злой Сякеры нават дакранацца да вас. Таму на Новы год сюды прыйдуць дзеці, каб упрыгожыць вас цацкамі.

Елачкі ледзьве не пачалі падскокваць ад радасці, але дзед Снежань спыніў іх:

— Ша! Пакуль стойце ціха, каб з вас снег не абсыпаўся. А да заўтрашняга дня засталася ўсяго адна ноч.

Елачкі спакойна паснулі. Усю ноч ім сніліся навагоднія цацкі.

У СНЕЖНІ ГОД КАНЧАЕЦЦА, А ЗІМА ПАЧЫНАЕЦЦА.

ЗІМОВАЯ НОЧКА — ДЗЕТКАМ САРОЧКА.



ЦВІСЦІ І ЖЫЦЬ!


Вось і абышлі вакол Сонца ўсе дванаццаць месяцаў. Замкнуўся гадавы круг. А круг, як вядома, не мае ні канца, ні пачатку.

Новы год — заўсёды новы —
Робіць на зямлі абновы.
Плуг картуз змакрэлы зняў,
Баразну ізноў заняў
І павёў, каб спелі нівы,
Каб усе былі шчаслівы.

Яшчэ гучаць апошнія словы пажаданняў Снежня, а з другога боку разам з першымі промнямі Сонца з'яўляюцца сейбіты Просінца — Студзеня.

Вы жывіце,
Вы цвіціце,
Як ніва да жніва
Ў сярэдзіне лета.
Багатага квету
На многія леты.




Хто самы
галоўны
Хто самы
галоўны
Хто самы
галоўны



КРУЧОК

Пытальнік чапляецца да кожнага слова.

— Як гэта чапляюся? Да якога слова? Хто гэта сказаў? Чулі? Вось так кожны раз.

Кручок, спытаўшы, заўсёды ўладкоўваецца ў канцы сказа. Схіляе галоўку, каб усё добра чуць. Але не думайце, што ён можа доўга заставацца на месцы. Кручок не такі. Варта пачуць што-небудзь цікавае або незразумелае, ён бяжыць і перапытвае: «Што? Дзе? Калі?»

Так вось распытваючы, Кручок зафанабэрыўся і вырашыў, што ён — самы галоўны знак прыпынку. Для большай гарантыі вырашыў усё ж папытацца і ў іншых знакаў. Што яны скажуць?





ЦВІЧОК

Клічнік, як толькі пачуў, пра што пытае Кручок, адразу ж і катэгарычна запратэставаў: «Не! Не! Не!»

Сказаў як адрэзаў. Цвічок не любіць гаварыць доўга. Тлумачыць таксама. Слова скажа, быццам цвік уваб'е. За гэта яго і празвалі Цвічком.

Кручок нават пачырванеў, але нічога не адказаў. Бо ведаў, што Цвічок прывык да сваіх загадных сказаў і больш нічога не дадасць і не ўбавіць.



КОСКА,


якая ніколі не дагаворвала да канца, пацвердзіла гэта і цяпер:

— На маю думку, калі ты хочаш ведаць, то я сказала б...

Кручок падумаў, што ён не вытрывае і закрычыць:

«Ну, чаго ты спынілася? Хоць раз ты можаш давесці пачатае да канца?» Але спахапіўся: «Большага ад яе, відаць, і не патрабуецца. Можа, яе абавязак выстраіць усё ў ланцужок, а канец сказа вызначыць Кропка?»

Але Кропка, як назло, з адказам марудзіла.




ВОЧКІ,

так называюць Двукроп'е. Вочкі ўсё бачаць, усё ведаюць і падсумоўваюць. Вось і цяпер яны пачалі пералічваць:

— Па-першае, Кручок не можа быць галоўным знакам прыпынку, бо ён адзін, як сагнуты палец. Па-другое, ён нічога не ведае сам, а ўсё ва ўсіх перапытвае. І ў рэшце рэшт, пакуль мы яго не прадставім, ні ён нікога не можа спытаць, ні іншыя яму не могуць адказаць.

«Ты паглядзі, куды яны горнуць, гэтыя Вочкі? — у думках абурыўся Кручок.— Але што з іх возьмеш. А калі іх праўда?»

— Мы,— працягвалі Вочкі далей,— калектыў. А прыказка ж сцвярджае, што адна галава добра, а дзве лепш. Трэба яшчэ разабрацца, хто тут самы галоўны.



ДУЖКІ

— Мы — таксама калектыў,— у два галасы азваліся Дужкі.— Значыць, маем усе падставы спадзявацца на...

— Не спадзявайцеся ні на што,— сказала як адрэзала Коска.— Вочкі заўсёды гавораць праўду. А вы толькі шэпчаце на вуха розныя тлумачэнні, дапаўненні, удакладненні...

Дужкі нічога ўдакладняць не сталі. Змоўклі, нібы вады ў рот набралі. (А самі думалі пра тое, як бы адпомсціць Косцы.)




ДВУКОССЕ

— Пра нас, спадзяемся, ніхто благога слова не скажа,— пачало Двукоссе.— Мы не ходзім з падказкамі. А да тых слоў, што паўтараем, наўрад ці хто прычэпіцца. Бо паўтараем мы мудрыя думкі, выказ-

ванні разумных людзей. Такім чынам, з'яўляючыся мудрым калектывам, мы...

Але тут умяшалася Шматкроп'е і не дало Двукоссю дагаварыць.




ШМАТКРОП'Е

— Не прыпісвайце сабе чужой мудрасці. А што датычыць калектыву, то большага за наш няма. Нездарма мы і завемся ШМАТкроп'е...

— Няхай вам не здаецца, што вас так многа,— зноў падала голас Коска.— Усяго тры. І нічога іншага вы не робіце, як пакідаеце няскончанай думку. Там, дзе вам уздумаецца.

— Такая наша служба,— адказала Шматкроп'е.— Палову сказа скажам, а другую сам дадумвай. Вось як тут:

— Галоўным знакам прыпынку з'яўляецца... Ну!..





АПОСТРАФ

Уважліва слухаў усіх выступоўцаў, а думаў пра сваё. Калі гаварыла Коска, ён ганарыўся, што як дзве кроплі вады падобны на яе. У Коскі, праўда, хвосцік уніз, а ў яго ўгору. Нават на Кропку падобны, калі падціснуць той жа хвосцік.

Раптам Апостраф пачуў, што яго клічуць.

— Ідзі сюды, пабудзь, калі ласка, паміж намі,— прасілі цвёрдая зычная і галосная літары.— Згубілася недзе змякчальная галосная, і тут тваё месца.

Апостраф быў паслухмяны — адгукнуўся на просьбу, пайшоў.

«Нічога, мой хвосцік таксама не з апошніх,— думаў ён.— І займаем мы не чыё, а сваё месца».






ЗЛУЧОК

— Праца твая важная, ніхто не пярэчыць,— здалёку пачаў вельмі далікатны ў размовах Злучок,— і спадзявацца на першынства трэба. Дарэчы, у нечым падобную ролю выконваю і я. Таму нас іншы раз і блытаюць. І я вельмі шкадую пра гэта. Вядома кожнаму, што ты замяняеш змякчальную галосную ў слове і трымаеш яго, каб не распалася. А я трымаю два словы, іншы раз і болей. Акрамя гэтага злучаю імёны, гарады, нават мацерыкі і цэлыя планеты.

Тым не менш, я не спадзяюся стаць самым-самым галоўным знакам прыпынку.




ПРАЦЯЖНІК

— Мы падобныя, як браты,— сказаў Злучку Працяжнік.— Але я старэйшы і таму ў два разы даўжэйшы за цябе. Мне падабаецца твая манера

трымацца. Але асабіста я не жадаю лічыць сябе менш важным, чым, скажам, Пытальнік або іншыя знакі прыпынку. Усе ведаюць, што ніводзін з іх нічога не можа сказаць, пакуль я не пакажу простую мову. Я даю ўсім слова. Значыць, я — пачатак. А пачатак заўсёды быў і застаецца...

— Быў і застаецца цяжкай справай,— перахапіла яго словы Коска.— Як, скажам, і канец. Але галоўнае ў тым, што...

Коска, як заўсёды, не змагла давесці думку да канца. І тады на дапамогу ёй прыйшла нарэшце Кропка.



КРОПКА

наслухалася, як выхваляюцца адзін перад адным знакі прыпынку, не вытрымала і кашлянула ў кулак.

— Кропка просіць слова! — абвясціў Клічнік-Цвічок.


— Галоўнае ў тым...— пачала Кропка і прымоўкла, даючы ўсім супакоіцца.


«Каго ж яна назаве галоўным знакам прыпынку?» — падумаў Пытальнік-Кручок, і сэрца яго нібы спынілася.

— Галоўнае ў тым,— паўтарыла Кропка яшчэ раз,— што кожны з вас павінен знаходзіцца на сваім месцы і сумленна выконваць ускладзеныя абавязкі.

— Малайчына Кропка! — усклікнуў Клічнік.

А Апостраф падумаў сам сабе: «Глядзі ты, як яна ўмее расставіць усе кропкі над «і». Калі б у яе быў яшчэ і хвосцік, яна была б — выліты я».




У
ЗАЗАПАРКУ



ЗААПАРК ПРЫЕХАЎ...

Аднойчы на ўскраіне нашага горада спынілася многа дзікіх звяроў і птушак. Прыехалі паглядзець, як мы жывём. Але ў сувязі з тым, што яны дрэнна ведалі правілы вулічнага руху, іх папрасілі спакойна сядзець у сваіх клетках, а паказацца ім людзі прыйдуць самі.

Пайшлі і мы з мамай і татам.



ЛЕЎ

Леў з доўгай грывай стаяў нерухома, як статуя, і пазіраў некуды паверх нашых галоў. Калі мы падышлі да яго клеткі, ён, нават не зірнуўшы на нас, нешта прарыкаў на незразумелай мове і ляснуў хвастом, нібы пастух пугай. Мабыць, хацеў, каб мы зразумелі, што ў яго, галоўнага звера, няма ні жадання, ні часу важдацца з намі.


Хаця праз імгненне мы заўважылі, што ў беднага Льва не было і магчымасці нас заўважыць — ён не мог адарваць позірку ад наглядчыка, які нёс яму ладны кус мяса.




СЛОН

Слон пазіраў на нас добрымі, як у дзеда, вачыма і ўсё ківаў галавой, быццам адказваючы на прывітанні. Зрэдку ён узнімаў нагу і, як пнеўматычным молатам, утрамбоўваў вакол сябе зямлю. Мабыць, баяўся праваліцца — такі ён быў вялікі. Затым, прытаміўшыся, выціраў морду вушамі, бо ў яго не было насоўкі.


Я падаў Слану цукерку. Ён узяў хобатам і падзякаваў — кіўнуў галавой.





ГІПАПАТАМ

Гіпапатам быў заняты па горла: выцягнуўся, разявіўшы рот велічынёй з коўш экскаватара, і не мог адсапціся. Стараўся злавіць кожную морквіну, якія ледзьве паспяваў шуфляваць яму чалавек з лапатай.



ЖЫРАФА

Жырафа рабіла выгляд, што не заўважае нас. Мабыць, палічыла людзей занадта малымі, дробнымі для сябе. А можа, ёй цяжка было сагнуць шыю? Увесь час яна пазірала на пад'ёмны кран за плотам. Хто ведае, можа, у яе маленькай галаве круцілася неадчэпная думка: «Вось хто мне да пары!»

Я ўяўляю, як бы здзівілася Жырафа, калі б заўважыла наверсе ў маленечкай кабіне яшчэ меншага чалавека. Такога, як і мы. Ён там працуе і, як хоча, круціць шыяй пад'ёмнага крана.


КЕНГУРУ

Маці-кенгурыха мела такое малое дзіцяня, што ў руках не было чаго трымаць. Таму, заткнуўшы за пояс край фартуха, яна зрабіла сабе нешта накшталт сумкі. Кенгураняці сумка была якраз.

Але як толькі малое заўважыла мяне, тут жа жвава спусцілася і некалькі разоў праскакала вакол маці. Відаць, хацела паказаць, што і яно можа хадзіць, калі захоча.

Мабыць, жэўжыку надышла пара спаць, і Маці-кенгурыха лёгенька падштурхнула яго, каб зноў залазіў у сумку. Ён залез сам, а маці горда паглядзела на нас, нібы гаворачы: «Вось які ўжо вялікі мой хлопчык!»





СТРАУС

У шырокім вальеры была ўсяго пара Страусаў. Няспешнымі крокамі яны ўвесь час вымервалі свой дом. Зрэдку прыпыняліся абмяняцца думкамі.


— Гэта не Афрыка,— казаў Страус.— Няма дзе прабегчыся, няма дзе схаваць галаву ў пясок.

— Якраз тут нядрэнна,— адказвала яму Страусіха, склёўваючы вінаград, што вісеў на прутах вальера.— Маем свой двор з вінаграднікам і зялёнай травой. Куды табе бегчы і ад каго хаваць галаву ў пясок?!

— У Афрыцы ўсё адно лепш, бо там — дома,— уздыхаў Страус і зноў пачынаў мераць вальер.







МАЛПА

Малпа лузгала семкі і шалупінне сплёўвала на падлогу. Гэтаму навучыў яе вялікі хлопчык, што даў семак, а цяпер стаяў каля клеткі і смяяўся з Малпы.


Яна зразумела нарэшце, што робіць непрыгожа, сыпанула вялікаму хлопчыку яго семкі і адвярнулася спінай.

Малайчына Малпа!



МЕДЗВЕДЗЯНЯ

Медзведзяня з неабрэзанымі кіпцямі ела непамытую моркву і вурчала ад задавальнення. Маці-мядзведзіца была побач, але не ўшчувала малога. Мабыць, есці гэтак яны прывыклі ў сваім лесе.





ВАВЁРКА

Дзве галіны ў розных кутках клеткі павінны былі нагадваць Вавёрцы лес, дзе яна нарадзілася. Была яшчэ і круцёлка. Калі Вавёрка бачыла, што вакол клеткі сабралася многа людзей, яна пачынала скакаць з кутка ў куток, з галіны на галіну. Распушвала хвост, расстаўляла лапкі. Так яна вучылася лётаць. Каб не дакаралі насельнікі лесу, што жыве на дрэвах, а лётаць не ўмее.

Доўга скакала Вавёрка, пакуль не спалохалася: гэтак і хадзіць развучыцца! Тады пераскочыла на круцёлку. Тут трэба было перабіраць лапкамі хутка-хутка, уяўляючы, што бяжыць з гары. Ажно дух займала. Няхай цяпер хто скажа, што яна ганьбіць тых, хто ходзіць.

Наскакаўшыся, набегаўшыся, знайшла ў кутку арэх і прысела там. Пярэднімі лапкамі паднесла арэх да пыскі, нібы пытаючы: «А хто ў цераме жыве?!»





ВЯРБЛЮД

Калі я яго ўбачыў, адразу ўспомніў татавы словы, якія ён сказаў аднойчы, спрабуючы ўбіць цвік у жалезабетонную сцяну. Тады ён сказаў: «Не ўвайсці гэтаму цвіку ў такую сцяну, як вярблюду не пралезці праз ігольнае вушка». І ўсё ж цвік тады ўбілі, перад тым дрэллю прасвідраваўшы, праўда, адтуліну ў сцяне.

А што рабіць з Вярблюдам, каб ён пралез праз ігольнае вушка? Тым больш што на спіне ў яго — два гарбы, як два добрыя кратавінні на поплаве.



ТАРПАНЫ

Загон нізка абгарадзілі жэрдкамі. Па крузе ў ім скакалі два невысокія конікі. На таблічцы было напісана, што завуць іх Тарпанамі, і яны — дзікія. Добра,

што Тарпаны не ўмелі чытаць, іначай пакрыўдзіліся б.

Побач з загонам спыніліся калёсы з травой. Траву прывезлі два Свойскія Кані. Тарпаны хутка наблізіліся да загароды і коратка заіржалі.


— Дзікія яны, а бачыш, хапае розуму падзякаваць,— ціха фыркнуў адзін Свойскі Конь.— Разумеюць, мабыць, што мне надакучыла цэлы дзень вазіць ім траву. Яны выгульваюцца, а я важу.

— Хоціць злаваць, яны ж — чужаземцы,— адказаў другі Свойскі Конь.— Калі мы будзем у іх у гасцях, яны нам прывязуць скошанай травы.



ЯК

Так коратка называецца гэта жывёліна. Яна як дзве кроплі вады падобна на нашага вала. Толькі Як апрануты ў доўгі і калматы кажух. Мабыць, у тых краях, адкуль ён прыйшоў, халадней, чым у нас.




САРНА І НАСАРОГ

Сарна здзіўлена азіралася па баках. Напэўна, яна трапіла сюды нядаўна. Відаць, з нашых лясоў, і дагэтуль не можа зразумець, куды трапіла. А тут звяроў паўнюсенька! Ды ў большасці не свае, заморскія, якіх яна раней не толькі не бачыла, а пра якіх і чуць не чула.

Вось, напрыклад, у клетцы насупраць стаіць нейкі выродак. Не конь і не свіння. Сказаць, што гэта бык, таксама не скажаш. У быка рогі на галаве, а ў гэтага на носе. Можа, такая мода пайшла насіць рогі на носе?

Тым часам Насарог — а гэта быў ён — спакойна пераступаў з нагі на нагу і паглядаў па баках, шукаючы, што б з'есці. У яго рогі на носе? Ну і што! Значыць, там яны і павінны быць. Іначай ён не звaўся б Насарогам. А мода тут ні пры чым.





ВОСЛІК

Вослік, глыбока задумаўшыся, нешта жаваў. У гэты час ён, мабыць, перажываў з-за ўбачанага, калі ехаў сюды. На лузе, міма якога імчаў цягнік, пасвіліся цяляткі і ягняты. «Трэба мне было гэта падарожжа?! — гараваў Вослік.— Лепш заставаўся б на пашы прыстойным вослікам і цяпер гарэзаваў бы, як хацеў...»



ЗЕБРА

Зебра стаяла спінай да Восліка. Была вельмі злосная на яго. Бо колькі ні гаварыла, што прыплыла сюды на караблі і пагэтаму ў яе матроская цяльняшка, Вослік усё роўна круціць галавой і ўпарта паўтарае:

— Не веру. Табе знарок зрабілі гэтыя палосы, каб адрозніваццa ад мяне.

Пасля такой заявы хіба ён сапраўды не... вослік?



АЛЕНЬ

Насустрач з каронай рагоў незвычайнай прыгажосці выйшаў Алень. Да аднаго з адросткаў рагоў прыліплі два зялёныя лісточкі — Алень нядаўна пасвіўся ў кустах.

— Паглядзіце, ён так засумаваў па лесе, што пачало лісце на рагах расці.



БАБРЫ І ЧАРАПАХА


Бабры і Чарапаха купаліся ў вадаёме, які для іх зрабілі.

— Зірніце на Чарапаху, яна прыйшла са сваім домам. А мы такую хатку пакінулі ў сябе на беразе возера...— жаласліва сказаў адзін з баброў.

— Не сумуй,— супакоіў яго другі.— Нас многа, калі разам узяцца, то і тут пабудуем хатку.


Сказана — зроблена: хутка бабрыная хатка была гатова на беразе вадаёма ў заапарку. Пасля працы стомленыя бабры палеглі на беразе і загараюць.

А Чарапаха топчацца на месцы. Ёй таксама хочацца пазагараць, толькі вось як домік скінеш?



ПІНГВІНЫ

Два Пінгвіны купаліся ў чорных душагрэйках і доўгіх, да пят, белых шараварах. Нягледзячы на гэта, холад прабіраў іх, відаць, да костак. Бо яны пінгвінілі хто каго перапінгвініць.



РЫБЫ

Дробныя рыбкі, падобныя на пацеркі, мітусліва снавалі. А самыя буйныя нерухома стаялі за шклом

акварыума. Імёны ў іх былі нішто сабе: Рыба-муляр, Рыба-молат, Рыба-піла... Нават Рыба-шабля была. Першыя, відаць па ўсім, былі майстрамі, а тая, з шабляй, думаю, ахоўвала іх, калі яны працавалі.

У кутку акварыума, не вытыркаючыся на святло, стаяла яшчэ адна рыба. Яе звалі, мабыць, Рыбай-гультайкай. Але не напісалі, як яе завуць, каб не сарамаціць.



ЦЮЛЕНЬ

Цюлень раз-пораз плёхаўся ў ваду. Затым выходзіў на бераг і загараў на сонцы. Думаў нябось: «Не чакаў, што так павернецца: кіраваў у заапарк, а трапіў на воды».




КРАКАДЗІЛ

Кракадзіл нагадваў шурпатую дошку. Здагадваюся, што ён сам ведаў пра гэта, бо ўвесь час ха-


ваўся пад вадой. Праўда, ноздры і вочы трымаў на паверхні, каб бачыць, куды плысці, каб дыхаць.

Калі з берага яго аклікалі, Кракадзіл ускідваў вочы і дакорліва пазіраў: «Чаму мяне завуць Кракадзіл? Я нарадзіўся на рацэ Ніл, то хай бы звалі мяне Крака-ніл?!»



ВОЎК

Страшны Воўк з бабіных казак здаваўся зусім бездапаможным і прыгнечаным. Не адзін я, мабыць, падумаў: ніякавата яму па суседству з Львом, Сланом, Насарогам... Іншая справа, калі б сюды заблудзіла Авечка. Хоць бы тая, згледзеўшы яго іклы, спалохалася: Воўк усё ж!..



ЛІСА І ЗАЯЦ

Ліса і Заяц, як і заўсёды, і тут былі суседзі. Праўда, тут Касы нікуды не ўцякаў, каб аж пяткі мільгалі, а Ліса яго не даганяла. З-за гэтага, відаць, і дурыўся,


не даваў спаць Кумцы. Як толькі здагадваўся, што тая кладзецца ў пасцельку, пачынаў грукаць у фанерную сценку:

— Бум-бум-бум...

Ліса падхоплівалася як апараная. Але заўважыўшы нас, рабіла выгляд, што гэта яна ўстала на шпацыр, а заечыя забаўкі яе ніколькі не турбуюць. У думках жа Ліса рвала Зайца на часткі, ажно поўсць ляцела. «Тваё шчасце, Касы, што ў нас столькі гасцей, і пры іх непрыстойна сварыцца,— думала яна.— Нічога, я дачакаюся, калі ўсе разыдуцца...»

А Зайцу хоць бы што. Нават калі госці і пойдуць, фанерная сценка ж застанецца.


— Бум-бум-бум...




ЗМЕІ

Спачатку я заўважыў доўгі хвост з вачыма. Зразумеў, што гэта Змяя. Вось яна падняла ўгору кончык з вачыма, паглядзела на мяне, затым свіснула другому хвасту, што расцягнуўся побач. Пасля таго як і другі з цікаўнасцю абгледзеў мяне, узяў ды завязаў вузельчык каля самага кончыка.


Думаю, што ён зрабіў знак, каб не забыцца, што і я прыходзіў у заапарк.





ВОЖЫК

Спачатку я падумаў, што ён круглы, як балабушка. А калі прыгледзеўся, заўважыў, што Вожык востры з ног да галавы. Самі іголкі, мордачка, вусы, нават галасок — усё-ўсё. Як яго толькі трымала мама на руках, калі Вожык быў маленькі?!




ХАМЕЛЕОН

Я вельмі доўга шукаў яго вачыма, пакуль не заўважыў на лісце. Ён быў зялёны — пад колер ліста. Калі ж я намерыўся разгледзець яго лепш, раптам Хамелеон знік. З цяжкасцю адшукаў зноў. Цяпер Хамелеон быў жоўты, як сцяна, да якой прымацаваўся. Не шанцуе — зноў згубіў! Ага, вось ён. Цяпер


Хамелеон гайдаўся на чырвонай стужцы. Толькі па руху стужкі я зразумеў, што ён там. Пасля і разгледзеў.

Як жа ён выглядае ў сапраўднасці? Але хіба пра тое хто скажа?! У Хамелеона ж няма свайго колеру.



ПАПУГАЙ

Папугай увесь час круціў галавой, спрабаваў злавіць хоць адно разборлівае слова, каб паўтарыць. Але навокал стаяў такі гармідар, што Папугай як ачмурэў — нічога нельга было разабраць. Ашаломлены Папугай маўчаў і думаў, што няблага было б, каб кожны чалавек меў свой голас, свае словы. І каб ведаў, калі і дзе іх гаварыць.



АРОЛ

Арол здзіўлена пазіраў на нас. Зверху, калі ён лётаў на волі, мы яму здаваліся дробненькімі, як мурашкі. І толькі цяпер Арол убачыў, што мы большыя за яго.



БУСЛЫ

Гэтым летам Буслы жылі на даху дзедавага дома. Калі захаладала, паляцелі ў вырай. Я думаў, што яны даўно ўжо ў цёплых краях. Аж трапілі ў заапарк!

Я пачаў прасіць наглядчыка:

— Дзядзя, пакажы іх людзям яшчэ трошкі, а затым адпусці на волю. Мой дзед не раскідаў іх буслянкі, яна іх чакае. І я чакаю.



ЧАЛАВЕК — СЯБРА ЗВЯРОЎ

...Вярнуўшыся дамоў, я расказаў дзецям з нашага двара, што бачыў у заапарку.

А ноччу прыснілася: быццам іду я адзін у вялікім густым лесе. Іду і ніколечкі не баюся. І нібыта вый-

шаў я на паляну, на якой сабраліся ўсе звяры і птушкі. Там, на паляне, не было ніякіх клетак. Але звяры не кінуліся на мяне — не хацелі палохаць. Яны спакойна сядзелі і чакалі, што я скажу.

— Я прыйшоў у госці ў вашу краіну,— сказаў я.

— А хто ты такі? — напышліва спытаў Паўлін.— У цябе нават прыстойнага хваста няма.

— Хвост — гэта не так ужо важна,— пачаў гаварыць Алень,— вось калі б у яго выраслі рогі, ён зрабіўся б моцным і прыгожым.

Слон, будучы добра выхаваным, узняў хобат, затрубіў, просячы цішыні, а калі ўсе сціхлі, сказаў:

— Вы хіба не пазнаяце яго? І не ведаеце, што яму не патрэбны галінастыя рогі і пушысты хвост? Яму не патрэбен нават хобат, таму што ён — чалавек!

— А-а-а, чалавек!..— у адзін голас загаварылі жыхары лесу.— Чалавек — наш сябра!

Потым усю ноч да самай раніцы мы гулялі разам у дзівосным лесе.





ЗМЕСТ

СТЭНІКЭ — БЫВАЛЫ ЧАЛАВЕК

Стэнікэ — Бывалы Чалавек — — — — 4
Дзве пары вачэй — — — — — — — — — 5
Разумныя пчолы... — — — — — — — — 6
Як Стэнікэ хоча быць працалюбівым — 7
Хто гультай? — — — — — — — — — — — 8
За двума зайцамі — — — — — — — — — 9
Калі не ведаеш, што сказаць... — — — 10
Пра дасціпнасць — — — — — — — — — 12
Калі двое сварацца... — — — — — — — 13
У страху вочы вялікія — — — — — — — 14
Смеласць — — — — — — — — — — — — 16

Палачкі — — — — — — — — — — — — — 17
Ад спеху нарабіў смеху — — — — — 18
Як Стэнікэ даспельваў абрыкосы — — 19
Што можна зрабіць сёння... — — — — 20
Пра яду — — — — — — — — — — — — 21
Трэска — — — — — — — — — — — — — 22
Залатыя нарукаўнікі — — — — — — — 23
Харошы дзень — — — — — — — — — 24
Як аукнеш... — — — — — — — — — — 25
Дзедаў посах — — — — — — — — — — 26
Вучыся і ў дрэва... — — — — — — — — 28
Калі дзіцё выцела палец — — — — — 29
Узяцца не трудна... — — — — — — — 31
Два зярняці, дзве фасоліны — — — — 33
Хто дбае... — — — — — — — — — — 35
Баразна на галаве — — — — — — — — 37
Карані — — — — — — — — — — — — — 39
Бывалы Чалавек — разумны чалавек — 40

АД СТУДЗЕНЯ ДА СНЕЖНЯ

Студзень (Январые) — — — — — — — — 42
Люты (Фебруарые) — — — — — — — — 43

Сакавік (Марціе) — — — — — — — — — 44
Красавік (Апрыліе) — — — — — — — — 46
Май (Май) — — — — — — — — — — — 47
Чэрвень (Юніе) — — — — — — — — — 48
Ліпень (Юліе) — — — — — — — — — 49
Жнівень (Аугуст) — — — — — — — — 51
Верасень (Септэмбрые) — — — — — — 52
Кастрычнік (Актомбрые) — — — — — 53
Лістапад (Наембрые) — — — — — — — 54
Снежань (Дэчэмбрые) — — — — — — 56
Цвісці і жыць! — — — — — — — — — 57

ХТО САМЫ ГАЛОЎНЫ?

Кручок — — — — — — — — — — — — — 60
Цвічок — — — — — — — — — — — — — 61
Коска — — — — — — — — — — — — — 61
Вочкі — — — — — — — — — — — — — 62
Дужкі — — — — — — — — — — — — — 63
Двукоссе — — — — — — — — — — — — 63
Шматкроп'е — — — — — — — — — — — 64
Апостраф — — — — — — — — — — — — 65
Злучок — — — — — — — — — — — — — 66
Працяжнік — — — — — — — — — — — 66
Кропка — — — — — — — — — — — — — 67

Заапарк прыехаў... — — — — — — — — 70
Леў — — — — — — — — — — — — — — 70
Слон — — — — — — — — — — — — — — 71
Гіпапатам — — — — — — — — — — — — 72
Жырафа — — — — — — — — — — — — 72
Кенгуру — — — — — — — — — — — — 73
Страус — — — — — — — — — — — — 74
Малпа — — — — — — — — — — — — 75
Медзведзяня — — — — — — — — — — 75
Вавёрка — — — — — — — — — — — — 76
Вярблюд — — — — — — — — — — — — 77
Тарпаны — — — — — — — — — — — — 77
Як — — — — — — — — — — — — — — 78
Сарна і Насарог — — — — — — — — 79
Вослік — — — — — — — — — — — — 80
Зебра — — — — — — — — — — — — — 80
Алень — — — — — — — — — — — — — 81
Бабры і Чарапаха — — — — — — — — 81
Пінгвіны — — — — — — — — — — — — 82
Рыбы — — — — — — — — — — — — — 82
Цюлень — — — — — — — — — — — — 83
Кракадзіл — — — — — — — — — — — — 83
Воўк — — — — — — — — — — — — — 84

Ліса і Заяц — — — — — — — — — — — 84
Змеі — — — — — — — — — — — — — — 85
Вожык — — — — — — — — — — — — — 86
Хамелеон — — — — — — — — — — — — 86
Папугай — — — — — — — — — — — — 87
Арол — — — — — — — — — — — — — 87
Буслы — — — — — — — — — — — — — 88
Чалавек — сябра звяроў — — — — — — 88





Литературно-художественное издание

СКОБИОАЛЭ Аурел Андреевич

ЧЕМУ
УЧИТ ПОГОВОРКА

Миниатюры


Минск, издательство «Юнацтва»
На белорусском языке

Літаратурна-мастацкае выданне

СКОБІААЛЭ Аурэл Андрэевіч

ЧАМУ
ВУЧЫЦЬ ПРЫМАЎКА

Мініяцюры





Рэдактар *У. М. Мазго*
Мастацкі рэдактар *У. М. Жук*
Тэхнічны рэдактар *Г. Ф. Дуброўская*
Карэктар *Л. С. Мануленка*

Здадзена ў набор 05.08.91. Падпісана да друку 25.12.92. Фармат 70×84$^{1}/_{16}$. Папера афсетная. Гарнітура Кудрашэўская энцыклапедычная. Афсетны друк. Ум. друк. арк. 6,54. Ум. фарб.-адб. 26,71. Ул.-выд. арк. 3,50. Тыраж 6000 экз. Зак. 1622.

Выдавецтва «Юнацтва» Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь. 220600, Мінск, Машэрава, 11.
Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінат МВПА імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.

